# МЕТАДАЛОГІЯ ГІСТОРЫІ

## Базавая вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў

*па спецыяльнасці*
**1-02 01 01 — «Гісторыя»**
*з дадатковымі спецыяльнасцямі:*
**1-02 01 02-04 — «Замежная мова»,**
**1-02 01 02-05 — «Рэлігіязнаўства»,**
**1-02 01 02-06 — «Сацыяльна-палітычныя дысцыпліны»**



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# МЕТАДАЛОГІЯ ГІСТОРЫІ

## БАЗАВАЯ ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ДЛЯ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

*па спецыяльнасці*
1-02 01 01 — «Гісторыя»
*з дадатковымі спецыяльнасцямі:*
1-02 01 02-04 — «Замежная мова»,
1-02 01 02-05 — «Рэлігіязнаўства»,
1-02 01 02-06 — «Сацыяльна-палітычныя дысцыпліны»

Мінск 2004

УДК 2—1(075.8)
ББК 86.2я73
М54

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Складальнік*
А. П. Жытко, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ

*Рэцэнзенты:*
С. Я. Новікаў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі і беларусазнаўства МДЛУ;
У. У. Куніцкі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі БДПУ

Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці базавай вучэбнай праграмы кафедрай славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі
(пратакол № 2 ад 01.09.03);
вучоным саветам гістарычнага факультэта
(пратакол № 2 ад 29.10.03);
саветам універсітэта
(пратакол № 2 ад 13.11.03)

Адказны за рэдакцыю А. П. Жытко
Адказны за выпуск У. С. Пуцік

**УДК 2—1(075.8)**
**ББК 86.2я73**

© А. П. Жытко, 2004
© ВВЦ БДПУ, 2004

# МЕТАДАЛОГІЯ ГІСТОРЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тлумачальная запіска

Да пачатку 90-х гг. XX ст. курс «Метадалогія гісторыі» ў савецкай вышэйшай школе не чытаўся. Практычна ён падмяняўся марксісцка-ленінскай канцэпцыяй гістарычнага развіцця, што прывяло да крызісу савецкай гістарыяграфіі.

Базавая вучэбная праграма змяшчае асноўныя дасягненні як сучаснай айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіі і філасофіі гісторыі. У праграме знайшлі адлюстраванне такія актуальныя пытанні, як выяўленне і абгрунтаванне прадмета гістарычнай навукі.

*Мэта курса* — азнаёміць студэнтаў з навейшымі дасягненнямі айчыннай і сусветнай гістарыяграфіі, улічваючы сучасны стан развіцця філасофіі і гісторыі.

*Задачы курса:*

- высветліць асаблівасці аб'екта гістарычнай навукі і спецыфікі яго пазнання ў параўнанні з прыродазнаўствам;
- раскрыць сацыяльныя функцыі гісторыі;
- паказаць структуру гістарычнага даследавання (крыніца, факт, катэгорыі, эмпірычны і тэарэтычны ўзроўні ў гістарычным пазнанні і інш. ).

Асаблівая ўвага ў праграме надаецца агульнанавуковым і спецыяльна-гістарычным метадам як інструмента пазнання ў гісторыі. Пры гэтым вялікую цікавасць выклікаюць нетрадыцыйныя метады. У прыватнасці гэта тычыцца метадаў кантэнт-аналізу і сацыяльна-псіхалагічных праз раскрыццё сутнасці псіхагісторыі дзяцінства, псіхагісторыі сацыяльных груп і псіхабіяграфіі. Акрамя гэтага, у вучэбнай праграме даецца расшыфроўка такіх асноўных прынцыпаў гістарычнага пазнання, як гістарызм, аб'ектыўнасць і каштоўнасны падыход.

## ЗМЕСТ КУРСА

### Тэма 1. Уводзіны ў курс «Метадалогія гісторыі»

Прадмет і задачы курса «Метадалогія гісторыі». Стан сучаснай айчыннай гістарыяграфіі. Неабходнасць перагляду асноўных катэгорый і прынцыпаў гістарычнай навукі.

Месца метадалогіі гісторыі ў сістэме навуковых ведаў. Метадалогія гісторыі як дысцыпліна, якая вывучае прыроду, прынцыпы і метады навуковага пазнання. Сувязь метадалогіі гісторыі з філасофіяй. Праблемы ўзаемадзеяння. Значэнне метадалогіі для правільнага адбору даследчых метадаў у канкрэтных гістарычных даследаваннях. Метад як сродак атрымання новых навуковых ведаў. Сучасныя метады гістарычнай навукі. Сувязь метадалагічных і гістарыяграфічных даследаванняў. Метадалогія і крыніцазнаўства. Роль метадалогіі гісторыі ва ўдасканаленні прафесійнай падрыхтоўкі студэнта-гісторыка.

Станаўленне метадалогіі гісторыі як спецыяльнай навуковай дысцыпліны. Фарміраванне метадалогіі гісторыі ў канцы XIX ст.— заканамерны вынік развіцця навуковых ведаў. Нямецкі гістарызм і пазітывізм як асноўныя напрамкі ў гістарыяграфіі

сярэдзіны і другой паловы XIX ст. Гнасеалагічны аптымізм і аб'ектывізм гістарыяграфіі XIX ст., яе адпаведнасць нормам «класічнай навукі». Асаблівасці пазітывісцкай метадалогіі гісторыі.

Метадалагічны крызіс у гістарычнай навуцы ў канцы XIX — пачатку XX ст. Пераўтварэнне стылю навуковага мыслення і ўсталяванне некласічнага прыродазнаўства. Метадалагізацыя навукова-гістарычнага мыслення і фарміраванне метадалагічных канцэпцый.

Станаўленне метадалогіі гісторыі ў савецкай навуцы.

Асноўныя сучасныя метадалагічныя канцэпцыі ў гістарычным даследаванні. Суадносіны аб'ектывісцкага і рэлятывісцкага падыходаў амерыканскай гістарыяграфіі. Адраджэнне прынцыпаў нямецкага гістарызму ў гістарычнай навуцы ФРГ. Школа «Аналаў». «Глабальная гісторыя» Брадэля.

Перагляд марксісцкіх прынцыпаў гістарычнага даследавання ў «постсавецкай» навуцы. Дыскусіі аб суадносінах фармацыйнага, тэхналагічнага і цывілізацыйнага падыходаў.

### Тэма 2. Прадмет гістарычнай навукі

Шматзначнасць паняцця «гісторыя». Гісторыя як мінулае. Гісторыя як веды аб мінулым і яго рознабаковыя формы.

Навуковая гісторыя. Сутнасць навуковага пазнання. Пераход ад класічнага да некласічнага паняцця навукі. Гісторыя і сацыяльныя навукі. Выдзяленне розных гістарычных дысцыплін. Прадмет гісторыі ў яго гістарычным развіцці.

Мінулае — галоўная асаблівасць прадмета гістарычнага даследавання. Рэтраспектыўны характар гістарычнага пазнання. Гісторыя — навука аб чалавеку і аб абставінах чалавечай дзейнасці. Генетычны падыход у гісторыі. Індывідуальны характар гістарычнага працэсу ў яго агульным сэнсе. Спалучэнне агульнага, асаблівага і адзінкавага ў гістарычным працэсе. Дыскусіі ў гістарыяграфіі аб галоўнай мэце гістарычнага даследавання.

Адрозненне прадмета гісторыі і сацыялогіі. Значэнне абагульненняў сацыялогіі і псіхалогіі для гісторыі. Небяспека «сацыялагізацыі» гісторыі. Роля індывідуальнага ў гісторыі як навуцы аб культуры. Апісальнасць у гістарычным даследаванні. Спробы вычлянення асобных «гістарычных законаў» у якасці галоўнага прадмета гістарычнага даследавання і іх вынікі.

### Тэма 3. Суб'ектна-аб'ектныя адносіны ў гістарычнай навуцы і спецыфіка гістарычнага пазнання

Гісторыя сярод іншых навук. Уплыў прыродазнаўства на гісторыю. Асаблівасці пазнавальных ідэалаў у розных групах навук. Асаблівасці аб'екта гістарычнага вывучэння. Гістарычны працэс — прадукт свядомай мэтанакіраванай дзейнасці чалавека. Наяўнасць аб'ектыўных і суб'ектыўных бакоў у грамадскім жыцці. Незавершанасць гісторыі як працэсу. Грамадства — суб'ект — аб'ект, сацыяльнае пазнанне — самапазнанне грамадства. Асаблівасць аб'екта гісторыі — мінулае. Праблема рэальнасці гістарычнага мінулага.

Асаблівасці пазнавальнай дзейнасці ў гістарычнай навуцы. Наяўнасць агульных прынцыпаў у гісторыі і прыродазнаўстве. Рэканструктыўны характар пазнання ў гісторыі. Адметныя адрозненні гістарычнай рэканструкцыі ад прыродазнаўчай. Абмежаваны характар прымянення эксперыменту ў гісторыі. Рэтраспектыўны характар гістарычнага пазнання. Пазітыўныя бакі рэтраспекцыі. Складанасці гістарычнай рэтраспекцыі. Абмежаванасць пазнавальных магчымасцей гісторыка сучаснасцю. Сучаснасць — сістэмаўтваральны элемент у развіцці гістарычнай навукі. Незавершанасць гістарычнага працэсу. Складанасці ў вывучэнні сучаснай гісторыі. Пазнавальнае значэнне вопыту сучаснасці для паглыбленага разумення мінулага.



Роля светапогляду ў гістарычнай творчасці. Прырода светапогляду. Уздзеянне светапогляду на розныя этапы гістарычнага даследавання. Ацэначны характар гістарычнага меркавання. Нацыянальныя, класавыя, партыйныя, канфесіянальныя, расавыя схільнасці ў гістарыяграфіі. Уздзеянне катэгарыяльнага апарату як спадчыны мінулага на гістарычную творчасць. Небяспека мадэрнізацыі і архаізацыі мінулага і шляхі іх пераадолення.

Значэнне гістарычнага вопыту для сучаснасці. Гістарычны вопыт — састаўная частка грамадскай свядомасці. Гістарычны вопыт і нацыянальная самасвядомасць грамадства. Сувязь і адрозненне гісторыі і ідэалогіі. Значэнне гістарычных ведаў для дзяржаўнай палітыкі. Палітычная і навуковая актуальнасць. Неабходнасць свабоднага развіцця гістарычнай навукі ў грамадстве.

### Тэма 4. Сацыяльныя функцыі гістарычнай навукі

Паняцце «сацыяльныя функцыі гістарычнай навукі». Сувязь гісторыі з задавальненнем грамадскіх запатрабаванняў.

Функцыя сацыяльнай памяці — найстаражытнейшая і ўстойлівая функцыя гісторыі. Сутнасць задач гісторыі як сацыяльнай памяці чалавецтва. Сацыяльная памяць і цывілізацыя. Гісторыя — пасрэдніца паміж пакаленнямі чалавецтва. Сацыяльная і індывідуальная памяць: падабенства і адрозненні. Гісторыя як арганізаваная сацыяльна арыентаваная памяць. Клопат народаў і дзяржаў аб захаванні помнікаў мінулага. Гісторыя як «сусветны трыбунал». Гісторыя як «прымiраючая памяць чалавецтва».

Навукова-пазнавальная функцыя гісторыі. Зварот гістарыяграфіі да мінулага для правільнага разумення сучаснасці. Фундаментальны характар навуковых канкрэтных ведаў аб мінулым. Месца гісторыі сярод іншых сацыяльных навук у самапазнанні грамадства. Немагчымасць навуковага пазнання сучаснасці без гістарычнага падыходу ў вывучэнні грамадства. Значэнне вывучэння вопыту сучаснасці для развіцця грамадства і гістарычнай навукі. Паспяховае выкананне гісторыяй эўрыстычнай функцыі — перадумова навуковага кіраўніцтва грамадствам і правядзення абгрунтаванай дзяржаўнай палітыкі.

Магчымасць і неабходнасць выкарыстання вынікаў гістарычных прац у сацыяльным прагназіраванні. Адрозненне прагназіравання ў навуках аб прыродзе і аб грамадстве. Поспехі і няўдачы сацыяльнага прагназіравання.

Выхаваўчая функцыя гісторыі. Задачы гісторыі па выхаванні маральнасці і грамадзянскай сумленнасці ў антычнай і сярэдневяковай гістарыяграфіі (Плутарх, Тацыт). Аб'ектыўнае выхаваўчае ўздзеянне на чытача гістарычных прац.

Роля гісторыі ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці. Патрыятызм і нацыяналізм. Неабходнасць маральнага і грамадзянскага выхавання моладзі на базе агульначалавечых каштоўнасцей, ідэалаў свабоды, дэмакратыі і павагі да чалавечай асобы.

Палітыка-ідэалагічная функцыя гісторыі. Нарматыўная і фактычная наяўнасць палітыка-ідэалагічнай функцыі гісторыі. Гісторыя і грамадская барацьба. Прагматычныя задачы гісторыі ў антычную эпоху. Гісторыя — прыслужніца багаслоўя і святой царквы ў сярэдневякоўі. Гісторыя — «навука князёў». Гісторыя — сродак барацьбы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нацый і палітычных партый у XIX ст. Ідэалагізацыя гісторыі ў савецкім грамадстве. Гісторыя і «халодная вайна». Сучасныя формы палітызацыі і ідэалагізацыі гісторыі.

**Тэма 5. Гістарычная крыніца**

Структура гістарычнай навукі: крыніца, факт, тэорыя. Крыніца — абавязковая ўмова пазнання мінулага. Значэнне крыніц для гісторыкаў.

Пазіцыі даследчыкаў гісторыі ў вызначэнні паняцця «Гістарычная крыніца». Крыніца — прадукт чалавечай дзейнасці. Неабходнасць пашыранай трактоўкі крыніцы. Важнасць выкарыстання ў навуковым даследаванні ўсёй сукупнасці розных тыпаў крыніц.

Крыніца і інфармацыя. Актуальныя і патэнцыяльныя крыніцы. Адлюстраванне ў крыніцах сацыяльных і індывідуальных характарыстык іх аўтараў. Вызначэнне светапогляду аўтара і яго сацыяльных арыентацый — адзін са шляхоў да аб'ектыўнага пазнання мінулага. Праблема пазнавальных магчымасцей крыніцы.

Інфармацыйныя магчымасці крыніц. Праблема адкрытай і ўтоенай інфармацыі. Крытыка інфармацыі крыніц. Важнасць выяўлення прагалаў у звестках аб мінулым.

**Тэма 6. Гістарычны факт**

Гістарычны факт — фундаментальная катэгорыя гістарычных ведаў. Важнасць метадалагічнага асэнсавання катэгорыі факта.

Разуменне катэгорыі факта ў гістарыяграфіі XIX ст. (пазітывізм, ранкеанства). Развіццё сацыяльна-эканамічнай гістарыяграфіі і ўскладненне разумення факта ў пазітывізме (В. О. Ключэўскі, Ш. Ланглуа, Ш. Сеньабос). Раскрыццё асаблівасцей сацыяльнай прыроды гістарычных фактаў у навуцы XIX ст. (В. Дыльтэй, М. І. Карэеў). Вылучэнне праблемы навуковага факта ў гісторыі і яе рэлятывісцкае вырашэнне ў гістарыяграфіі (Р. Ю. Віпер, К. Бекер). Крытыка рэлятывістамі аб'ектывісцкай гістарыяграфіі. Эвалюцыя аб'ектывісцкага і рэлятывісцкага разумення катэгорыі факта ў сучаснай гістарыяграфіі. Аб'ектывісцкая аснова тэорыі факта ў савецкай гістарыяграфіі. Трактоўкі катэгорыі факта ў сучаснай заходняй метадалогіі гісторыі (Э. Карр, С. Х'юз, А. Стэрн, Дж. Клапенберг, Т. Хаскел і інш.).

Сэнс гістарычнага факта. Тры выпадкі ўжывання паняцця факт: 1) факты гістарычнай рэчаіснасці (падзеі); 2) факты гістарычнай крыніцы; 3) навукова-гістарычныя факты.

Асаблівасці фактаў гістарычнай рэчаіснасці. Іх прырода. Непаўторнасць у эксперыменце. Аб'ектыўнасць у адносінах да аўтараў крыніц і даследчыкаў мінулага. Інварыянтнасць і нязменнасць фактаў у сваёй сутнаснай завершанасці ў прасторы і часе. Асаблівасці фактаў гістарычнай крыніцы.

Праблема суб'ектыўнага характару фактаў гістарычнай навукі. Сэнс «устанаўлення» навуковага факта. Дзейнасць гісторыка па рэканструкцыі факта. Навуковы факт як мадэль ці выява падзеі мінулага. Навуковы факт як прадукт сучаснага мыслення. Змястоўная незавершанасць і навуковая невычарпальнасць факта. Факт — дынамічная цэласная сістэма, якая знаходзіцца ў пастаянным развіцці. Залежнасць факта ад тэорыі. Факт і інтэрпрэтацыя.

**Тэма 7. Эмпірычны і тэарэтычны ўзроўні ў гістарычным даследаванні**

Тры ўмоўныя ўзаемазвязаныя аперацыі ў гістарычным даследаванні: 1) збор фактаў; 2) пабудова мадэлі; 3) інтэрпрэтацыя. Асаблівасці эмпірычнага ўзроўню пазнання. Тэарэтычны ўзровень пазнання як ідэальны разрыў матэрыялу. Узаемасувязь двух узроўняў, апасродкаванне іх практыкай гістарычнага даследавання.



Аперацыі з фактамі на эмпірычным і тэарэтычным узроўнях. Адбор фактаў. Пабудова фактаў у мадэль. Мадэль і тэорыя гісторыка. Новыя тэорыі — новыя пункты гледжання на мінулае, якое звязана з сучаснасцю. Уздзеянне гатовых тэорый на працу наступных пакаленняў гісторыкаў. Класіфікацыя навуковых тлумачэнняў і сфера іх выкарыстання. Тлумачэнне праз закон, яго абмежаванні. Каўзальныя і генетычныя тлумачэнні і іх роля ва ўстанаўленні і вывучэнні прычынна-выніковых радоў. Структурна-функцыянальныя тлумачэнні, іх значнасць у даследаванні гістарычных тыпаў. Неабходнасць комплекснага выкарыстання разнастайных відаў тлумачэнняў.

**Тэма 8. Катэгорыі гістарычнай навукі**

Выкарыстанне навуковых катэгорый як умова паспяховага гістарычнага даследавання. Выкарыстанне гістарычнай навукай універсальных катэгорый філасофіі: сутнасць і з'ява, змест і форма, гістарычная неабходнасць і выпадковасць, гістарычная альтэрнатыўнасць, рэчаіснасць і магчымасць. Сэнс гісторыі. Гістарычная прастора. Эвалюцыйнае і рэвалюцыйнае развіццё.

Метадалагічнае значэнне катэгорый «сусветна-гістарычны» і «лакальна-гістарычны». Катэгорыя «гістарычны час»: рэальны і суб'ектыўны аспекты. Эвалюцыя ўяўленняў аб часе. «Унутраны час» вывучаемай эпохі.

Праблемы перыядызацыі. Яе ўмоўны характар. Залежнасць перыядызацыі ад мэтавай установкі гісторыка. Крытыка паняццяў: век, стагоддзе, сярэднявечча, рэнесанс, адраджэнне.

Іерархія гістарычных катэгорый: пастаянства (прыродна-геаграфічныя ўмовы), структуры (рэлігія, філасофскія сістэмы, навука, мастацтва), кан'юнктуры (крывыя руху народанасельніцтва, аб'ёму вытворчасці, цэн, заработнай платы).

**Тэма 9. Прынцыпы гістарычнага пазнання**

Гістарызм як прынцып, які адлюстроўвае асаблівасці гістарычных ведаў. Грамадства як арганізм, які развіваецца ў часе і прасторы. Гістарычны падыход — неабходная ўмова вывучэння з'яў грамадскага жыцця. Гістарызм як спосаб мыслення новаеўрапейскай цывілізацыі. Светапоглядны характар гістарызму. Гістарызм як прынцып навуковага пазнання. Асноўныя патрабаванні да навуковага даследавання з пазіцыі гістарызму. Узаемасувязь гістарызму як спосабу мыслення і як прынцыпу пазнання.

Зацвярджэнне прынцыпу гістарызму ў грамадазнаўстве ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. Абгрунтаванне асноўных элементаў гістарычнага падыходу да мінулага ў межах нямецкага ідэалістычнага гістарызму. Кансерватыўны палітычны сэнс нямецкага гістарызму. Марксісцкі гістарызм — адлюстраванне дыялектыка-матэрыялістычнага падыходу да гісторыі. Арыентацыя марксісцкага гістарызму на класавую інтэрпрэтацыю гісторыі. Палітызаванасць марксісцкага гістарызму, яго прэтэнзіі на навуковую выключнасць.

Сувязь гістарызму і рэлятывізму ў навуцы канца XIX — першай чвэрці XX ст. Неабходнасць пераадолення перабольшванняў гістарычнага рэлятывізму. Ператварэнне гістарызму ў агульнанавуковы прынцып пазнання. Узаемасувязь гістарызму з іншымі прынцыпамі вывучэння гісторыі.

Аб'ектыўнасць — агульны прынцып навуковага пазнання. Аб'ектыўнасць і аб'ектывізм у гістарыяграфіі. Фактары, якія патэнцыяльна забяспечваюць аб'ектыўнасць навуковага пазнання мінулага. Залежнасць вынікаў навуковага даследавання ад прафесійнай падрыхтоўкі даследчыка, фундаментальнасці яго навуковай канцэпцыі, творчага падыходу, выкарыстання сукупнасці даследчых метадаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Каштоўнасны падыход у гісторыі. Наяўнасць пэўных каштоўнасных адносін гісторыка да прадмета вывучэння. Два спосабы засвойвання суб'ектам аб'екта: навуковы (лагічны) і каштоўнасны. Ацэначная дзейнасць гісторыка — адна з форм актыўнасці суб'екта пазнання.

Фарміраванне каштоўнаснага падыходу ў метадалогіі гісторыі. Яго абвяшчэнне адзіным метадам пазнання мінулага ў неакантыянстве. Адмаўленне аксіялагічнага метаду ў пазітывізме канца XIX — пачатку XX ст. Сучасны неааб'ектывізм аб месцы каштоўнаснага падыходу ў гістарычнай працы. Дыскусія аб каштоўнасным падыходзе ў савецкай і постсавецкай гістарыяграфіі.

Функцыяніраванне катэгорыі каштоўнасці ў гістарыяграфічнай практыцы. Прырода каштоўнасці. Каштоўнасці як прадукт матэрыяльнай і духоўнай дзейнасці чалавецтва. Аб'ектыўны характар каштоўнасцей. Іх гістарычная зменлівасць. Наяўнасць у змесце каштоўнасцей не толькі адноснага, але і абсалютнага, агульначалавечага.

Каштоўнасць і ацэнка. Сутнасць ацэнкі. Гнасеалагічнае значэнне ацэнкі ў навуцы. Каштоўнасны падыход і праблема аб'ектыўнасці гістарычнага пазнання. Уздзеянне на гісторыка класавых, партыйных, нацыянальных, канфесійных і іншых каштоўнасных установак. Марксісцкі прынцып партыйнасці — разнастайнасць каштоўнаснага падыходу. Небяспека абвяшчэння гістарычна абмежаваных каштоўнасных установак у якасці крытэрыя ацэнкі ў дзейнасці даследчыка.

**Тэма 10. Метады гістарычнага пазнання**

Каштоўнасць агульнанавуковых метадаў даследавання. Лагічныя і гістарычныя метады. Важнасць лагічных метадаў для раскрыцця руху аб'екта ў часе. Выкарыстанне індуктыўна-аналітычнага метаду пры ўзыходжанні ад канкрэтнага да абстрактнага. Прыёмы атаясамлівання нятоесных аб'ектаў (класіфікацыя, тыпалагізацыя, ідэалізацыя). Прымяненне інтэгральна-індуктыўнага метаду пры ўзыходжанні ад абстрактнага да канкрэтнага. Індукцыя і дэдукцыя. Аналіз і сінтэз. Апісанне і вымярэнне. Статыстычныя і дынамічныя метады даследавання. Роля і месца агульнанавуковых метадаў у вывучэнні гістарычнай рэальнасці.

Метад класавага аналізу. Сутнасць класавага падыходу. Марксісцкія і іншыя трактоўкі паняцця «класа», іх абмежаванасць. Выкарыстанне метаду ў гістарычных даследаваннях савецкіх і замежных вучоных.

Гісторыка-генетычны метад. Праблема выяўлення прычынна-выніковых сувязей і заканамернасцей развіцця. Накіраванасць метаду на аналіз яго дынамічнай прыроды. Прымяненне метаду ў пазітывісцкай гістарыяграфіі. Недахопы метаду. Даследаванне «генезісу» сацыяльнай з'явы ў сучаснай гістарычнай навуцы.

Гісторыка-параўнальны метад. Аналогія як лагічная аснова гісторыка-параўнальнага метаду. Умовы супастаўлення аб'ектаў. Параўнанне ў прасторы і часе. «Палітыка» Арыстоцеля — першы прыклад прымянення метаду. Гісторыка-параўнальны метад у вывучэнні гісторыі асобных народаў (ад Ф. Вальтэра да Л. М. Гумілёва). Параўнанне ў канцэпцыі цывілізацыі О. Шпенглера і А. Тойнбі.

Гісторыка-тыпалагічны метад. Тыпалагізацыя аб'ектаў і з'яў як класіфікацыя. Межы выкарыстання метаду. Тыпы грамадскіх з'яў у пазітывісцкай гістарыяграфіі. Крытыка пазітывістаў неакантыянцамі. Адмова ад тыпізацыі ў В. Дыльтэя («метад разумення»). Метад «аднясення да культурных каштоўнасцей» Г. Рыкерта. Ідэальныя тыпы М. Вебера. «Канструяваны тып» Х. Бекера. Тыпалогія ў прагматызме як спосаб арганізацыі аб'екта даследавання. Прымяненне тыпалогіі ў даследаваннях па гісторыі Беларусі.



Гісторыка-сістэмны метад. Сістэмны падыход і сістэмны аналіз у сучаснай навуцы. Аб'ект як цэласная сістэма. Пабудова, структура і функцыі сістэмы. Структурны і функцыянальны аналіз як прыёмы ў сістэмных даследаваннях. Тэндэнцыя да ідэальнага абстрагавання і фармалізацыі вывучаемых гістарычных з'яў.

Метады дыяхроннага аналізу гісторыі. Адрозненне дыяхроннага і сінхроннага метадаў аналізу. Варыянты структурна-дыяхроннага аналізу. Вопыт прымянення дыяхроннага аналізу ў гістарычных даследаваннях.

Сацыяльна-псіхалагічны падыход у гістарыяграфіі. Неабходнасць даследавання псіхалагічных матывацый гістарычнага працэсу. Спробы стварэння псіхалагічнай канцэпцыі асобы ў гісторыі: гістарычная псіхалогія. Выкарыстанне паняцця «базісная асоба». Псіхааналітычная канцэпцыя З. Фрэйда і адкрыццё новых перспектыў у гістарычных даследаваннях. Тэорыя З. Фрэйда аб ролі «падсвядомага».

Асноўныя напрамкі псіхагістарычных даследаванняў: даследаванне масавых працэсаў, псіхабіяграфіі, гісторыя дзяцінства. Сацыяльна-палітычныя змены ў гісторыі з пункту гледжання псіхагісторыкаў. Перспектывы псіхагісторыкаў.

## ЛІТАРАТУРА


***Асноўная***

1. *Барг М. А.* Категории и методы исторической науки. М., 1984.
2. *Жуков Е. М.* Очерки методологии истории. М., 1980.
3. *Карсавин Л. П.* Философия истории. СПб., 1993.
4. *Ковальченко И. Д.* Методы исторического исследования. М., 1987.
5. Методология истории / Под ред. А. Н. Алпеева, В. Н.Сидорцова, В. Ф. Кушнера. Мн., 1996.
6. *Могильницкий Б. Г.* Введение в методологию истории. М., 1989.
7. *Сергейчик Е. М.* Философия истории. СПб., 2002.
8. *Сидорцов В. Н.* Методология исторического исследования (механизм творчества историка). Мн., 2000.
9. Теоретико-методологические проблемы исторического познания: Материалы к междунар. науч. конф. Минск, 1—2 февраля 2001 г. Мн., 2000. Т. 1—2.

***Дадатковая***

1. *Блок М.* Апология или Ремесло историка. М., 1975.
2. *Брэтон Ф., Пру С.* Выбух камунікацыі. Мн., 1995.
3. *Виппер Р. Ю.* Очерки теории исторического познания. М., 1911.
4. *Гулыга А. В.* Эстетика истории. М., 1974.
5. *Гуревич А. Я.* Исторический синтез и школа «Анналов». М., 1993.
6. *Дильтей В.* Описательная психология. М., 1924.
7. *Ерофеев Н. А.* Что такое история? М., 1974.
8. Историческая наука: вопросы методологии / Под ред. Ю. В. Бромеля. М., 1986.
9. *Карр Э.* Что такое история. Нью-Йорк, 1962.
10. *Ключевский В. О.* Методология русской истории. 1884/1885 ак. год. // Соч.: В 9 т. М., 1986. Т. 6.
11. *Коллингвуд Р. Дж.* Автобиография. М., 1980.
12. *Коммеджер Г. С.* Природа и изучение истории. Колумбия. Огайо. 1966.
13. *Лаппо-Данилевский А. С.* Методология истории. СПб., 1910. Ч. 1—2.
14. *Ракитов А. И.* Историческое познание. М., 1982.
15. *Риккерт Г.* Философия истории СПб., 1908.
16. *Стерн А.* Философия истории и проблема ценностей. Гаага, 1962.
17. *Тойнби А. Д.* Постижение истории. М., 1990.
18. *Хьюз С.* История как искусство и как наука. Нью-Йорк. Эванстон. Лондон, 1964.
19. *Ясперс К.* Смысл и назначение. М., 1991.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗМЕСТ

Метадалогія гісторыі .......... 3
Тлумачальная запіска .......... 3
Змест курса .......... 3
Літаратура .......... 9

Вучэбнае выданне

**Базавая вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў**

*па спецыяльнасці*
1-02 01 01 — «Гісторыя»
*з дадатковымі спецыяльнасцямі:*
1-02 01 02-04 — «Замежная мова»,
1-02 01 02-05 — «Рэлігіязнаўства»,
1-02 01 02-06 — «Сацыяльна-палітычныя дысцыпліны»

*Складальнік*
**Жытко** Анатоль Паўлавіч

*Рэдактар* В. С. Казіцкая

*Тэхнічнае рэдагаванне* А. А. Пакалы

*Камп'ютэрная вёрстка* А. М. Ахрэмчык

Падпісана ў друк 11.03.04. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная. Гарнітура *Арыял.*
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 0,5. Ул.-выд. арк. 0,6. Тыраж 50 экз. Заказ 145.

*Установа адукацыі* «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка». Ліцэнзія ЛВ № 196 ад 04.02.03. 220050, Мінск, Савецкая, 18.

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:* Вучэбна-выдавецкі цэнтр БДПУ.
Ліцэнзія ЛП № 486 ад 02.04.02. 220007, Мінск, Магілёўская, 37.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ